


ГІСТОРЫКІ ПРА ДЗЕНЬ УЗ'ЯДНАННЯ 2



ЯК МАСТАЦТВА ЗБЛІЖАЕ НАШ НАРОД 8

16 ВЕРАСНЯ 2021 г.
ЧАЦВЕР
№ 178 (29547)

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Бяспека

## АКТУАЛЬНЫ ПАРАДАК ДНЯ

**Савет калектыўнай бяспекі 16 верасня ў Душанбэ абмяркуе праблемы міжнароднай і рэгіянальнай бяспекі і іх уплыў на бяспеку дзяржаў — членаў АДКБ. У сталіцы Таджыкістана адбудуцца юбілейны саміт дзяржаў — членаў Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва, а таксама пасяджэнне кіраўнікоў краін АДКБ і ШАС. У мерапрыемствах возьме ўдзел Прэзідэнт Беларусі. Напярэдадні Аляксандр Лукашэнка прыляцеў з рабочым візітам у Таджыкістан, дзе сустрэўся з кіраўніком гэтай краіны Эмамалі Рахмонам. У кіраўніка беларускай дзяржавы таксама запланаваны шэраг двухбаковых сустрэч з замежнымі калегамі.**

Члены СКБ абмяркуюць актуальныя праблемы міжнароднай і рэгіянальнай бяспекі і асноўныя вынікі дзейнасці Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы ў міжсесіённы перыяд. Адным з самых важных пытанняў стане сітуацыя ў Афганістане і яе ўплыў на бяспеку дзяржаў АДКБ. «У ходзе сесіі СКБ, як чакаецца, будзе прынята Дэкларацыя Савета калектыўнай бяспекі, а таксама падпісаны шэраг дакументаў, якія датычацца міратворчасці, забеспячэння дзейнасці войскаў (калектыўных сіл) АДКБ і аснашчэння Калектыўных сіл аператыўнага рэагавання АДКБ сучаснымі ўзбраеннем, ваеннай і спецыяльнай тэхнікай, спецыяльнымі сродкамі, разгледжаны бюджэт АДКБ на 2022 год», — адзначыў прэс-сакратар АДКБ Уладзімір Зайнетдзінаў.

Учора ў Душанбэ прайшло сумеснае пасяджэнне Савета міністраў замежных спраў, Савета міністраў абароны і Камітэта сакратароў саветаў бяспекі АДКБ. Бакі абмеркавалі ваенна-палітычную абстаноўку ў рэгіёне і падвялі вынікі дзейнасці арганізацыі ў міжсесіённы перыяд. «Мы праінфармавалі аб сітуацыі, якая складваецца ў нашым рэгіёне, нашых адносінах з заходнімі партнёрамі, праблемах, якія нам штучна ствараюць заходнія партнёры. У цэлым нашы падыходы знаходзяць абсалютную падтрымку ва ўсіх саюзнікаў па АДКБ», — заявіў міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір Макей. Прадстаўнікі дзяржаў — членаў АДКБ абмеркавалі таксама сітуацыю ў Афганістане, развіццё ваенна-тэхнічнага супрацоўніцтва, барацьбу з кіберпагрозамі.

На пасяджэнні кіраўнікоў дзяржаў — членаў ШАС плануецца прыняць рашэнні аб запуску працэдуры прыёму Ірана ў якасці паўнапраўнага члена ШАС і надзяліць статусам партнёра па дыялогу Егіпет, Катар і Саудаўскую Аравію. Раней генеральны сакратар Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва Уладзімір Нораў адзначыў, што на саміце будуць прыняты рашэнні, якія «адкрыюць новую старонку ў паступальным развіцці арганізацыі, памножаць яе ўнёсак у падтрыманне міру і стабільнасці ў рэгіёне і ў свеце, забеспячэнне ўстойлівага развіцця і ўмацаванне культурна-гуманітарнага супрацоўніцтва на шырокай прасторы ШАС».

Афганская тэматыка таксама будзе разгледжана на пасяджэнні кіраўнікоў дзяржаў АДКБ і ШАС, запланаваным на 17 верасня ў Душанбэ. Дадзеная сустрэча — гэта новы фармат узаемадзеяння дзвюх міжнародных арганізацый, якія створаны па ініцыятыве кіраўніка беларускай дзяржавы і аднагалосна падтрыманы саюзнікамі па АДКБ.

**Пётр ДУНЬКО.**

Блізкая ўлада

## З ЛЮДЗЬМІ ТРЭБА РАЗМАЎЛЯЦЬ

**Учора кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Ігар СЕРГЕЕНКА, наведаў Валожынскі раён. Там ён азнаёміўся з работай Валожынскага лясгаса і пагутарыў з працоўным калектывам, а пасля правёў прыём грамадзян у Валожынскім райвыканкаме.**



У цэлым калектыў лясгаса настроены на актыўную работу, сёння людзі маюць добры заробак, які ў сярэднім па прадпрыемстве складае 1400 рублёў. У асобных катэгорый работнікаў ён яшчэ вышэйшы. Выконваюцца планавыя паказчыкі, праводзіцца работа па павышэнні лясістасці, па захаванні лесу, яго аднаўленні. Ігар Сергеенка падкрэсліў важкі ўклад прадпрыемстваў лясной галіны ў эканоміку краіны. Разам са старшынёй Валожынскага райвыканкама Яўгенам Круковічам ён адказаў на пытанні прысутных, якія датычыліся развіцця малых гарадоў і сацыяльнай інфраструктуры ў Валожынскім раёне.

На прыём грамадзян кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта ў райвыканкаме запісаліся жыхары не толькі Валожынскага, але і іншых раёнаў вобласці: Мінскага, Крупскага, Лагойскага. Частка пытанняў датычылася экалагічных праблем, у прыватнасці блізкага размяшчэння ад жылога сектара прыватных дрэваперапрацоўчых прадпрыемстваў, якія сваёй дзейнасцю ствараюць дыскамфорт і парушаюць пакой людзей. Ігар Сергеенка падкрэсліў, што, каб зразумець вастрыню падобных праблем, трэба паставіць сябе на месца чалавека, які апынуўся ў такім непрыемным становішчы. Задаваліся таксама пытанні і па рабоце жыллёва-камунальнай гаспадаркі, ахове здароўя і іншыя.

— Хачу адзначыць, што ў Адміністрацыю Прэзідэнта ў месяц паступае больш за 2000 зваротаў грамадзян, — адзначыў Ігар Пятровіч. — Яны датычацца самых розных сфер: работы жыллёва-камунальных арганізацый, будаўніцтва жылля, стану вулічна-дарожнай сеткі, медыцынскага абслугоўвання і іншых. Але аналіз нашай работы паказвае, што колькасць зваротаў грамадзян паступова зніжаецца. У Мінскай вобласці назіраецца менавіта такая тэндэнцыя. Пры гэтым павялічваецца колькасць калектыўных, ці паўторных, зваротаў.

Прыём у Валожынскім райвыканкаме паказаў, што з'яўляюцца новыя, можна сказаць, рэдкія звароты людзей — тая ж сітуацыя са скаргамі на дзейнасць дрэваапрацоўкі. З гэтымі пытаннямі адпаведныя дзяржаўныя структуры будуць абавязкова разбірацца, запэўніў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

«Самае галоўнае, што людзі павінны разумець, — усё павінна рабіцца публічна, — адзначыў Ігар Сергеенка. — Добрая практыка, якая складаецца ў Мінскай вобласці, гэта публічнае абмеркаванне тых альбо іншых пытанняў — па развіцці населеных пунктаў, будаўніцтве розных аб'ектаў, развіцці інфраструктуры. Каб не было ўсялякіх чутак, крыўд, скаргаў. Калі ідаць перспектыву на доўгі перыяд, напрыклад, пяцігоддзе, калі ўлічваецца меркаванне грамадскасці, тады звычайна не ўзнікае ніякіх праблем».

**Сяргей РУЧАНАЎ,**
**фота аўтара.**

ISSN 1990 - 763X
21178>
9 771990 763008

<u>Наталля КАЧАНАВА</u>:

Акцэнты

## «У ГОД НАРОДНАГА АДЗІНСТВА НАМ НЕАБХОДНА КАНЧАТКОВА ЗРАЗУМЕЦЬ: НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ КРАІНЫ ЗАЛЕЖЫЦЬ АД КОЖНАГА З НАС»

**Аб гэтым заявіла Старшыня Савета Рэспублікі падчас круглага стала на тэму «Дзень народнага адзінства — як сімвал кансалідацыі беларускага народа», які адбыўся ўчора ў Нацыянальным гістарычным музеі.**



Фота БелТА.

— Дзень народнага адзінства асабліва значны для нас як для суверэннай дзяржавы, якая самастойна вызначае шлях свайго гістарычнага і сацыяльна-эканамічнага развіцця, ажыццяўляе незалежную шматвектарную знешнюю палітыку на аснове добрасуседства, узаемапавагі і неўмяшання ва ўнутраныя справы, — падкрэсліла спікер верхняй палаты парламента.

Гэты дзень знойдзе шчыры і шырокі водгук у сэрцах нашых людзей, і яго будуць трапятліва адзначаць яшчэ многія пакаленні беларусаў, бо ён непарыўна звязаны з асаблівымі для нас гістарычнымі падзеямі, выказала ўпэўненасць Наталля Качанава.

Яна нагадала, што восенню 1939 года беларускі народ, раней гвалтоўна падзелены, каб дагадзіць чужым кан'юнктурным палітычным інтарэсам, уз'яднаўся ў рамках Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі.

Наталля Качанава прывяла словы Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі аб тым, што «памяць аб гэтай падзеі жыве ў сэрцах беларусаў, таму што яна стала актам гістарычнай справядлівасці ў адносінах да беларускага народа, падзеленага супраць яго волі».

— Менавіта таму 17 верасня стаў важным днём у гісторыі беларускай дзяржавы і беларускай нацыі, своеасаблівым адпраўным пунктам для новага адліку беларускай дзяржаўнасці, — перакананая яна.

Старшыня Савета Рэспублікі акцэнтавала ўвагу на тым, што суверэнітэт Рэспублікі Беларусь і яе нацыянальныя інтарэсы — непахісны прыярытэт дзяржавы, але не ўсім гэта падабаецца.

— Спробы расхістаць сітуацыю ў краіне прымаліся неаднаразова. Падзеі 2020 года чарговы раз прадэманстравалі ўсім нам, наколькі крохкі мір і парадак, — падкрэсліла спікер верхняй палаты парламента. — Але мы, з'яднаўшыся вакол нашага лідара, Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, змаглі пераадолець пагрозы «каляровай рэвалюцыі». Мы не дапусцілі дэстабілізацыі дзяржаўных інстытутаў і абвальвання эканомікі.

Наталля Качанава адзначыла, што гэта дата — яшчэ і сімвал перамогі для тых, хто хоча бачыць Беларусь мірнай, моцнай і незалежнай.

— У Год народнага адзінства нам неабходна канчаткова зразумець: незалежнасць краіны залежыць ад кожнага з нас. Захаваць суверэнітэт, спакойнае і стваральнае жыццё на сваёй зямлі — наш святы абавязак, — падкрэсліла яна. — Калі мы хочам жыць у міры і дабрабыце, то павінны зрабіць усё магчымае для развіцця і росквіту роднай Беларусі.

***(Больш падрабязна аб выніках работы круглага стала чытайце ў заўтрашнім нумары «Мясцовага самакіравання».)***

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

*Падчас круглага стала адбылося таксама адкрыццё адмысловай выстаўкі, прысвечанай вызначальнай даце, а таксама прэзентацыя кнігі Уладзіміра Ліхадзедава «17 верасня. Дзень народнага адзінства», што выйшла ў Выдавецкім доме «Звязда».*
*Падрабязна пра выстаўку — на 8-й стар.*

## НА СВАЁЙ ЗЯМЛІ




Ігара КАРАНЕЎСКАГА, механізатара АТ «Прынёманскі» Навагрудскага раёна, я застаў на працоўным месцы — за рулём кормаўборачнага камбайна. Ён адзін з тых, хто атрымаў з рук Прэзідэнта напярэдадні Дня народнага адзінства высокую дзяржаўную ўзнагароду — ордэн Пашаны. Але адзначаць няма калі: кожны пагодны дзянёк у вяскоўцаў на ўліку.

Ігару Каранеўскаму крыху больш за пяцьдзясят. Нарадзіўся ў сялянскай сям'і, жыве ў старажытнай Любчы. Дваццаць трэці год працуе ў сельскай гаспадарцы. Па працы і пашана — летась прызнаваўся «Чалавекам года Гродзеншчыны», мае медаль «За працоўныя заслугі».

Калі б не 17 верасня 1939-га — нічога б гэтага ў яго жыцці не было. Варта пагартаць старонкі «Звязды» 82-гадовай даўнасці (а сёння ў чытачоў ёсць такая магчымасць), каб зразумець, як ставіліся да беларускіх сялян за польскім часам. З зусім недалёкай ад Любчы вёскі Рубяжэвічы «гвалтоўна ўвялі 180 коней. На жудасныя крыкі і просьбы паліцэйскія адказалі збіваннем». Ці была будучыня ў нашчадкаў тых, каго не лічылі за людзей, адмаўлялі ў праве жыць у дастатку і звацца народам?

...У распараджэнні Ігара Каранеўскага — тры жалезныя кані — вясною на «Раce-05» ён уносіць мінеральныя ўгнаенні, зімою на трактары МТЗ працуе на падвозцы, летам і восенню — на кормаўборачным камбайне «Ягуар» на сенажы і на сіласе. Летам скасіў 33 тысячы тон траў. Цяпер убірае кукурузу на сілас, ужо ўбраў 12 тысяч тон. Чалавек шчыра працуе на сваёй роднай зямлі. Мае за працу матэрыяльную ўзнагароду і пашану. Як мы, беларусы, кажам: пэўна, яно так і трэба.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

ЦЫТАТА ДНЯ



**Ігар ЛУЦКІ,**
**намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта:**

*«Сучасная моладзь добрая. Адкрыты дыялог у Рэспубліканскім доме моладзі сабраў шырокі спектр удзельнікаў. Былі прадстаўнікі ВНУ, студатрадаўскага руху. Мне вельмі спадабалася. Добрыя пытанні задавала моладзь. Ёсць разуменне таго, што людзі робяць і дзеля чаго яны гэта робяць. Мы на некаторых момантах акцэнтавалі ўвагу. У прыватнасці, на тым, што неабходна пашыраць магчымасці працы для моладзі. Тыя льготы і прэферэнцыі, якія дзяржава вызначыла для студатрадаўскага руху, беспрэцэдэнтныя. На тэрыторыі постсавецкіх дзяржаў мы, напэўна, адзіныя, хто захаваў гэты рух у такім маштабе. Таму ўсё, што сёння адбываецца напярэдадні вялікага свята — Дня народнага адзінства, — умацоўвае веру ў тое, што маладое пакаленне мы вырасцілі годнымі патрыётамі нашай краіны».*

## І БУДЗЕ СЛАЎНЫ КАРАВАЙ!

**Апошнім пунктам рэспубліканскага аўтапрабегу «Сімвал адзінства» стаў мемарыяльны комплекс «Курган Славы» ў Мінскай вобласці. Патрыятычнае мерапрыемства прайшло ў кожным рэгіёне Беларусі. Аўтапрабег ахапіў 118 раёнаў за 13 дзён. Кожны раён перадаваў удзельнікам марафону імянныя мяшэчкі са збожжам новага ўраджаю, якія сталі сімвалам аб'яднання і адзінства. На пляцоўцы мемарыяльнага комплексу «Курган Славы» ўдзельнікам аўтапрабегу ўчора была перададзена 118-я частка ўраджаю для таго, каб спячы сімвалічны каравай.**

**БелТА.**



Фота БелТА.

Гісторыя газеты — гісторыя краіны

## «НІЯКІЯ МЕЖЫ БОЛЬШ НЕ ПАДЗЕЛЯЦЬ НАШУ РОДНУЮ ЗЯМЕЛЬКУ — БЕЛАРУСЬ»

**Менавіта гэтымі словамі — шчырымі, па-народнаму цёплымі, радаснымі — нашы папярэднікі-«звяздоўцы» віталі дзень, які стаў пачаткам яднання беларусаў на сваёй зямлі. Гэтыя словы — у агульным загалоўку, пад якім выйшаў нумар «Звязды» ўжо назаўтра пасля пачатку вызваленчага паходу Чырвонай арміі і які практычна цалкам быў прысвечаны тэме народнага яднання...**


ЗВЯЗДА
СОВЕЦКІ ЎРАД АДДАЎ РАСПАРАДЖЭННЕ ГАЛОЎНАМУ КАМАНДВАННЮ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ ДАЦЬ ЗАГАД ВОЙСКАМ ПЕРАЙСЦІ ГРАНІЦУ І ЎЗЯЦЬ ПАД СВАЮ АБАРОНУ ЖЫЦЦЁ І МАЕМАСЦЬ НАСЕЛЬНІЦТВА ЗАХОДНЯЙ УКРАІНЫ І ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ
НІЯКІЯ МЕЖЫ, НІЯКІЯ ПАГРАНІЧНЫЯ СЛУПЫ БОЛЬШ НЕ ПАДЗЕЛЯЦЬ, НЕ ПАСЯКУЦЬ НА ЧАСЦІ НАШУ РОДНУЮ ЗЯМЕЛЬКУ-БЕЛАРУСЬ

Спачатку мы хацелі прысвяціць гэтаму нумару публікацыю-агляд. Але, самі яго з цікавасцю пагартаўшы — уважліва пачытаўшы, — вырашылі, што найлепш будзе апублікаваць яго факсіміле. Такі вось падарунак сённяшнім чытачам — газета, якая выйшла восемдзясят два гады назад. Гэткі кавалачак жывой гісторыі — і яна сапраўды паўстае на тых старонках, і пачынаеш ведаць тое, чаго не ведаў, асэнсоўваць тое, над чым не задумваўся. Калі хтосьці яшчэ сумняваецца, што 17 верасня 1939 года — дата для нашага народа лёсавызначальная, пачытайце сённяшні нумар. Дакладней, не сённяшні, а той, які дайшоў да нас з 18 верасня 1939-га.

Дарэчы, даваенныя газеты ўвогуле — вялікая рэдкасць: газетная папера гарыць найлепш, а Беларусь тры гады акупацыі і бітваў за яе літаральна палала. Больш-менш поўныя даваенныя падшыўкі «Звязды» ёсць у Нацыянальным архіве ды ў Нацыянальнай бібліятэцы. Нацыянальная бібліятэка некалькі гадоў назад распачала вельмі важную справу — алічбаванне даваенных газет. Мы звярнуліся туды з просьбай падзяліцца лічбавай версіяй «Звязды» верасня 1939 года. Дзякуючы рупліўцам галоўнай кніжнай скарбніцы краіны кожны чытач сённяшняга нумара можа даведацца пра тагачасныя падзеі з першых вуснаў. Або, правільней сказаць, з першых радкоў.

СТАР. 3

# ГРУНТОЎНАЯ РАЗМОВА АБ НАШЫМ АДЗІНСТВЕ

**У Палацы прадстаўнікоў па ініцыятыве Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі адбыўся круглы стол «Міжнацыянальны мір і згода як аснова адзінства беларускага народа».**

## Выклікі часу і наша згода

Яго ўдзельнікі адзначалі вялікае значэнне таго, што размова ў Палаце прадстаўнікоў на надзвычай актуальную тэму па часе амаль супала з маючым адбыцца святкаваннем у краіне Дня народнага адзінства. Вобразна выказаўся наконт доўгатэрміновых мэт па захаванні і ўмацаванні міжнацыянальнага міру і згоды **старшыня Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Генадзь ДАВЫДЗЬКА.** На яго думку, народнае адзінства неабходнае, бо ворагі любой краіны першае, што спрабуюць зрабіць, — раз'яднаць. «Мы зараз знаходзімся ў глыбокім разуменні важнасці гэтай тэмы і разумеем, што тут не канцылярскім клеем трэба клеіць, а зваркай варыць, зварваць усе слаі нашага грамадства па рэлігійных, нацыянальных, класавых і іншых прыкметах», — заявіў на пачатку работы круглага стала старшыня профільнай камісіі.

Паводле слоў **намесніка старшыні Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Ліліі АНАНІЧ,** дзень 17 верасня стаў сімвалам нашай згуртаванасці, імкнення да міру і ўзаемаразумення, пераемнасці пакаленняў, непахіснасці і самадастатковасці беларускай нацыі і дзяржаўнасці. Гэтае свята ўвабіло ў наша жыццё як даніна павагі да айчыннай гісторыі, як памяць аб акце найвялікшай гістарычнай справядлівасці — уз'яднання Заходняй і Усходняй Беларусі.

На яе думку, пры ўсіх адрозненнях мы адзіныя, незалежна ад нацыянальнасці, веравызнання, сацыяльнага статусу, адукацыі і ўзросту. Мы адзіныя ў сваёй павазе да нашай любімай Беларусі, нашай Радзімы. Згода, вернасць традыцыям і маральным каштоўнасцям дапамогуць нам пераадолець любыя цяжкасці і захаваць краіну незалежнай і моцнай. А мудрасць, разважлівасць, духоўная еднасць былі і застаюцца найлепшымі якасцямі беларускага народа, лічыць дэпутат.

Таму, упэўнена намеснік старшыні Пастаяннай камісіі, нам вельмі важна захаваць мір і стабільнасць, найлепшыя традыцыі і дасягненні, якія гэтаму спрыяюць. Бо захаванне стабільных міжэтнічных адносін разглядаецца на дзяржаўным узроўні як адно з найважнейшых дасягненняў дзяржаўнага будаўніцтва. А адзін з самых важных фактараў міжнацыянальнай стабільнасці — выразная і паслядоўная палітыка беларускай дзяржавы ў гэтай сферы грамадскага жыцця, што і адлюстравана ў нацыянальным заканадаўстве, звярнула ўвагу Лілія Ананіч.

Цікавасць у суразмоўцаў і прысутных выклікала выступленне **упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Аляксандра РУМАКА.** Ён, у прыватнасці, адзначыў, што міжнацыянальны мір і згода ў нашай краіне маюць прававыя асновы. Заканадаўствам Беларусі, у тым ліку ў Канстытуцыі, замацавана роўнасць усіх людзей, незалежна ад іх нацыянальнасці. Гарантуецца права на захаванне сваіх культурных традыцый, на развіццё нацыянальна-культурных адносін у грамадстве.

## Дзяржаўны клопат аб дыяспарах

Аляксандр Румак акцэнтаваў увагу прысутных і на тым факце, што з боку дзяржавы дыяспарам аказваецца значная матэрыяльная дапамога ў распаўсюджванні літаратуры на роднай мове і на іншыя мэты. Таксама, напрыклад, набываюцца касцюмы для нацыянальных калектываў мастацкай самадзейнасці, якія абавязкова ўдзельнічаюць практычна ва ўсіх культурных мерапрыемствах як на мясцовым, так і на рэспубліканскім узроўнях. Гэтыя выдаткі фінансуюцца з бюджэту праз апарат упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў.

Па звестках прамоўцы, сёння ў Беларусі жывуць прадстаўнікі 156 нацыянальнасцяў. Усяго ў нашай краіне больш за 200 нацыянальна-культурных арганізацый міжнароднага, рэспубліканскага, мясцовага ўзроўняў. Усе яны ўваходзяць у 25 нацыянальна-культурных аб'яднанняў, сказаў Аляксандр Румак.

У грунтоўнай размове ў Палаце прадстаўнікоў удзельнічалі парламентарыі, прадстаўнікі нацыянальных дыяспар, кіраўнікі нацыянальна-культурных аб'яднанняў. Сярод іх быў заўважаны першы намеснік старшыні савета Федэральнай нацыянальна-культурнай аўтаноміі «Беларусы Расіі», Герой Расійскай Федэрацыі Аляксандр Дарковіч.

Яго пляменнік **старшыня савета Федэральнай нацыянальна-культурнай аўтаноміі «Беларусы Расіі» Сяргей КАНДЫБОВІЧ** з Чырвонай плошчы Масквы, а дакладней, каля магілы Невядомага салдата, у сваім відэазвароце да ўдзельнікаў круглага стала павіншаваў усіх жыхароў Беларусі з надыходзячым самым маладым новым беларускім святам — Днём народнага адзінства. Сяргей Кандыбовіч зрабіў акцэнт на тым, што гэта свята нясе важны, нават сакральны сэнс.

**Старшыня грамадскага аб'яднання «Мінскае гарадское армянскае культурна-асветніцкае таварыства Айастан» Георгій ЕГІЗАРЯН** звярнуў увагу на адсутнасць у краіне канфрантацыі паміж нацыянальнасцямі, і гэта заслуга дзяржавы. Армяне ў Беларусі маюць магчымасць самастойна каардынаваць сваю грамадскую дзейнасць, заўсёды могуць разлічваць на падтрымку дзяржавы.

**Намеснік старшыні грамадскага аб'яднання «Саюз палякаў Беларусі» Данута СУРМАЧ** засяродзілася на тэме міжкультурнага дыялогу як асновы талерантнасці, павагі і ўзаемадапамогі ў беларускім грамадстве. Пра здабыткі, планы і асаблівасці дзейнасці ў нашай краіне гаварылі прадстаўнікі нацыянальных дыяспар украінцаў і азербайджанцаў.

У ходзе круглага стала быў дадзены старт фотафестывалю пад эгідай Палаты прадстаўнікоў для рэспубліканскіх і рэгіянальных СМІ. Яго назва: «У кадры — Год народнага адзінства». Мэты фотафестывалю: садзейнічанне раскрыццю патэнцыялу мясцовай і рэспубліканскай прэсы па фарміраванні ў грамадстве цікавасці да гістарычнай памяці беларускага народа, актывізацыя карысных грамадскіх ініцыятыў, выхаванне моладзі на ідэалах гуманізму, дабра, справядлівасці і традыцыйных каштоўнасцяў.

Найлепшыя фотаработы будуць потым прадстаўлены на спецыяльнай выстаўцы ў парламенце.

**Леанід ТУГАРЫН.**

# ДЗЕНЬ УЗ'ЯДНАННЯ: ВЯРТАННЕ ПАМЯЦІ

## Не трэба глядзець на гісторыю чужымі вачыма

**Гісторыя — вельмі складаны ланцужок, кожнае са звёнаў якога мае значэнне. Выцягнеш адно звяно, і ўжо не скласці аб'ектыўнай карціны пра падзеі, у якія была ўцягнута наша краіна ў 30—40-я гады мінулага стагоддзя. А без гэтых ведаў узнікае і неразуменне месца і ролі беларускага народа ў еўрапейскай і сусветнай прасторы. Каб зразумець прычыны працэсаў, якія адбываюцца сёння, важна са спакойнай галавой разабрацца з мінулым, а гэта немагчыма без звароту да першакрыніц.**

**Гаворкі аб тым, што дата ўз'яднання Заходняй і Усходняй Беларусі павінна вярнуцца ў дзяржаўны каляндар, ідуць ужо не адно дзесяцігоддзе, і толькі сёлета мы будзем святкаваць дату на належным узроўні. Ці не спазніліся мы з яе вяртаннем (такое свята адзначалася ў даваенныя гады, а пасля Вялікай Айчыннай вайны, калі Польшча стала палітычным і эканамічным саюзнікам Савецкага Саюза, яго адсунулі на другі план)? І ці маглі б мы не дапусціць фальсіфікацыі ваеннай гісторыі, калі б раней сталі адзначаць такі дзень? Адказы на гэтыя пытанні гучалі падчас прэс-канферэнцыі «Рыжскі мір у лёсе беларускага народа».**

«Мы атрымалі, з аднаго боку, стыгматызацыю даты 17 верасня ў гістарычнай памяці польскага народа, для іх гэта трагедыя. З іншага боку, у нашым грамадстве з'явіліся адчуванні, што нешта з гэтай датай не тое, — заўважыў **рэктар Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ.** — Любы народ мае права на інтэрпрэтацыю гістарычных падзей, але нельга скажаць і фальсіфікаваць гісторыю. А сёння дайшло да таго, што гэтыя скажэнні адбываюцца ўжо на міжнародным узроўні. У Еўрапейскім саюзе ўжо спрабуюць паставіць знак роўнасці паміж нацысцкай Германіяй і Савецкім Саюзам і нават абвінаваціць СССР у развязванні Другой сусветнай вайны. Але ёсць дакументы, якія сведчаць, што гэта не адпавядае рэчаіснасці, што лёс Польшчы быў вырашаны яшчэ да таго, як быў заключаны пакт Молатава—Рыбентропа аб ненападзенні паміж СССР і Германіяй. Нам няма чаго саромецца гэтай даты. Заключэнне падобных дагавораў і сакрэтных пратаколаў было нармальнай практыкай 1930-х гадоў. Сама ж Польшча выкарыстала гэты механізм, калі яшчэ ў 1934 годзе падпісала дагавор аб ненападзенні з Германіяй, а ў 1938-м заключыла з Германіяй тайнае пагадненне, па якім частка Чэхаславакіі адышла ў склад Польскай дзяржавы. Мы павінны глядзець на сваю гісторыю вачыма свайго народа: аб'ектыўна, спакойна, з разуменнем таго, што станоўчага ці адмоўнага прынеслі для нашага народа пэўныя гістарычныя падзеі».

**Загадчык аддзела найноўшай гісторыі Беларусі Інстытута гісторыі НАН кандыдат гістарычных навук Сяргей ТРАЦЦЯК** упэўнены, што з вяртаннем свята народнага адзінства мы фактычна «ўскочылі ў апошні вагон»: «У 2019 годзе засталася незаўважанай славутая дата — 80 гадоў уз'яднання вялікага беларускага народа ў адзінай дзяржаве. Спатрэбіліся падзеі мінулага года, каб людзі згадалі пра тое, што былі раз'яднаны, і ўз'яднанне заклала падмурак той беларускай дзяржаве, у якой мы зараз жывём. Калі б не было падзей 17 верасня 1939 года, мы б аказаліся ў зусім іншай краіне. Тое, што свята з'явілася ў календары, я лічу аднаўленнем справядлівасці».

Але мы вярнулі не проста чырвоную дату — за ёй стаіць узнаўленне гісторыі, і згадваць пра гэта трэба не раз на год, а працаваць пастаянна. Дагэтуль не быў зняты ніводзін мастацкі фільм, прысвечаны падзеям уз'яднання. Тэма існавання беларусаў як падзеленай нацыі на працягу двух дзесяцігоддзяў засталася дзесьці на задворках і ў гістарычным успрыманні, і ў гістарычнай адукацыі.

Беларусы не лічылі міжваенную Польшчу сваёй радзімай, і гэта, на думку Сяргея Аляксандравіча, ясна паказалі падзеі верасня-кастрычніка 1939 года. Калі б было інакш, ніякага Вызваленчага паходу ў тым выглядзе, як мы ведаем, проста не адбылося б. Можна згадаць пра падзеі ў Фінляндыі, дзе ў 1939 годзе высветлілася, што фіны не лічаць Савецкі Саюз сваёй айчынай, а Савецкую армію — вызваліцельніцай.

18 сакавіка 1921 года быў заключаны Рыжскі мір — гэта трагічная дата беларускай гісторыі, калі тэрыторыя Беларусі была падзелена паміж Польшчай і СССР. Развіццё абедзвюх частак ішло ў розных кірунках, і толькі ў верасні — лістападзе 1939 года гэта гістарычная несправядлівасць была пераадолена. «Могуць сказаць, што гэта стала магчымым толькі ў абстаноўцы пачатку Другой сусветнай вайны і краху Польскай дзяржавы, — заўважае Сяргей Траццяк. — Але Польская дзяржава Рыжскім дагаворам падпісала сабе смяротны дагавор з адкладзеным выкананнем, а ўсё з-за апасенняў, што любое з'яўленне савецкіх войск на тэрыторыі Заходніх Беларусі і Украіны прывядзе да страты гэтых тэрыторый, нават калі тыя ступяць туды як саюзнікі. Усё гэта і прывяло Польскую дзяржаву да катастрофы верасня 1939 года. У рэшце рэшт, не варта забываць, што заходнія дзяржавы, якія ў лістападзе 1938 года здалі Гітлеру Чэхаславакію, пачынаючы перагаворы з Савецкім Саюзам аб ваенным пакце супраць Германіі, не збіраліся ваяваць з Гітлерам усур'ёз. Разлік быў на тое, што Савецкі Саюз стане ваенным гарантам Польшчы. Але не прымалася ў разлік, ці хоча гэтага Польшча, і ці гатовы да таго Савецкі Саюз. Перадваенны крызіс 1938—1939 гадоў у Еўропе ясна паказаў, да чаго здольны прывесці народы і дзяржавы палітычныя эліты, апантаныя ідэяй уласнага інтарэсу і неадкладнымі мэтамі і задачамі. Тое, што Савецкі Саюз у апошні момант ухіліўся ад удзелу ў нявыгаднай для яго на той момант вялікай вайне ў Еўропе і атрымаў магчымасць два гады праводзіць самастойную палітыку ўзброенага нейтралітэту, трэба лічыць не патаканнем агрэсару, а, наадварот, падрыхтоўкай да будучага адпору».

Сапраўды разабрацца ў гістарычных падзеях 1920—1940-х гадоў няпроста. Але беларускія даследчыкі паклапаціліся аб тым, каб усе факты раскласці па палічках і давесці да ведама шырокай грамадскасці. Праведзена каласальная работа. Выдадзены тры кнігі, прысвечаныя падзеям, звязаным з узнікненнем Беларускай Рэспублікі і трагічным дагаворам 1921 года. Прычым дастаткова вялікім тыражом — у тысячу экзэмпляраў. І нагодай для выдання, як прызнаўся **рэдактар выдавецтва «Беларусь» Сяргей ПЕШЫН,** сталі не толькі стагоддзе з падпісання Рыжскага мірнага дагавора і тое, што ў нас упершыню шырока будзе адзначацца Год народнага адзінства, а сітуацыя, што складваецца ў свеце, калі ў выніку перайначвання гісторыі беларусаў сталі рабіць датычнымі да развязвання Другой сусветнай вайны.

Зборнік дакументаў «Польшча — Беларусь. 1921—1953 год» — вынік супрацы Інстытута гісторыі НАН, Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь і Цэнтральнага архіва КДБ РБ, Фонду «Гістарычная памяць» (Масква). Тут прадстаўлена падборка дакументальных матэрыялаў па розных аспектах узаемаадносін Польшчы і Беларусі, можна прасачыць перадумовы падзей і наступствы, якія пасля былі з імі звязаныя. Захоплены і пасляваенны час, бо шлях да міру і згоды быў даволі складаным: толькі ў 1953 годзе былі ліквідаваны апошнія прадстаўнікі польскага нацыяналістычнага падполля, якое ў пасляваенныя гады скацілася да простага бандытызму, грабяжоў і гвалту.

Таксама ў выдавецтве «Беларусь» выйшаў двухтомнік «Рыжскі мір у лёсе беларускага народа», які ўяўляе сабой сінтэз калектыўнай манаграфіі і зборніка дакументаў. Тут разглядаюцца розныя аспекты працэсаў, якія адбываліся на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў грамадска-палітычнай, сацыяльна-эканамічнай, духоўна-культурнай сферах. У міжваенныя гады Польшча аказалася шматнацыянальнай дзяржавай, палякі ў ёй складалі толькі 64 працэнты, тэрыторыю ж Заходняй Беларусі наогул на 70 працэнтаў засялілі беларусы, але, нягледзячы на гэта, курс быў узяты на паланізацыю і асіміляцыю. Кожны раздзел двухтоміка падмацоўваецца падборкай дакументаў і матэрыялаў.

Як паведаміла **старшы навуковы супрацоўнік Цэнтра агульнай гісторыі, міжнародных адносін і геапалітыкі Інтытута гісторыі НАН Беларусі Вольга БАРОЎСКАЯ,** у выданнях былі пададзены многія з крыніц, якія раней не былі даступныя даследчыкам, да некаторых з іх толькі нядаўна адкрыўся доступ. Сярод іх — дакументы з архіва Знешняй палітыкі Расійскай Федэрацыі, якія праліваюць святло на Рыжскі мірны дагавор і савецка-польскія перагаворы 1920—1921 гадоў. У прыватнасці, там захоўваецца перапіска Іофе і Чычэрына. Уведзены ў навуковы абарот зусім новыя крыніцы Расійскага дзяржаўнага архіва сацыяльна-палітычнай гісторыі. На аснове крыніц падрыхтаваны матэрыял, які паказвае новыя факты, звязаныя з заключэннем Рыжскага мірнага дагавора. Так, стала вядома, што была магчымасць допушчэння беларускай дэлегацыі ў якасці чацвёртай краіны-ўдзельніцы, але польская дэлегацыя выказалася супраць знаходжання беларусаў за сталом перагавораў.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**


### ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ОАСО «Би энд Би иншуренс Ко», г. Минск, ул. Я. Коласа, 38. Тел.: + 375 29 688-04-88** |

**Предмет аукциона**

**Лот № 1**
**Местоположение – г. Минск, ул. Замковая, 33**

**Офисная мебель и оргтехника в составе 437 единиц:** ПЭВМ, коммутаторы, кондиционеры, счетчики банкнот, копировальные аппараты, пожарная сигнализация, источники бесперебойного питания, компьютерная сеть, система симметричной связи, счетно-денеж. машинки, мебель, кабельная телефонная линия, системы вентиляции и кондиционирования воздуха, сейфы, комплекты перегородок, аппарат нагрева-охлаждения воды, рольшторы (полный перечень см. на сайте организатора аукциона **ipmtorgi.by**)

**Начальная цена лота № 1 (с НДС 20 %) – 147064,32 бел. руб.** (снижена на 20 %)
**Шаг аукциона – 7 353,22 бел. руб.**

**Лот № 2 (одним лотом)**
Местоположение – **Минская обл., Минский р-н, Щомыслицкий с/с, направление ТЭЦ-4, 3-й пер. Монтажников**

| Наименование (назначение) | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес (номер дома) |
|---|---|---|---|
| **Изолированное помещение № 1** (производственное помещение) | 206,3 кв. м | 600/D-91728 | 3А-4 |
| **Изолированное помещение № 2** (административное помещение) | 221,7 кв. м | 600/D-91729 | 3А-4а |
| **Изолированное помещение № 3** (производственное помещение) | 288,4 кв. м | 600/D-91730 | 3А-4б |
| **Административное помещение** | 233,6 кв. м | 600/D-40239 | 3-5 |
| **Административное помещение** | 83,9 кв. м | 600/D-40241 | 3-6 |
| **Складское помещение** | 205,2 кв. м | 600/D-40243 | 3-7 |

Обременение: площади помещений частично сданы в аренду (с информацией можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **ipmtorgi.by**)

**Начальная цена лота № 2 (с НДС 20 %) – 1 913 280,00 бел. руб.** (снижена на 20 %)
**Шаг аукциона – 95 664,00 бел. руб.**

**Лот № 3**
Местоположение – **г. Минск, ул. Лили Карастояновой, 32-19**

| Наименование (назначение) | Общая площадь | Инвентарный номер |
|---|---|---|
| **Помещение санитарно-бытового назначения** | 1,7 кв. м | 500/D-7028275 |

**Начальная цена лота № 3 (с НДС 20 %) – 3552,00 бел. руб.** (снижена на 20 %)
**Шаг аукциона – 177,60 бел. руб.**

**Порядок ознакомления:** в рабочие дня по предварительному согласованию, +375 (29) 680-80-99 (Шубко Юлия Владимировна)

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, в том числе документ, подтверждающий внесение задатка с отметкой банка, в размере 10 % от начальной цены предмета аукциона, зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **ipmtorgi.by**

В случае регистрации на аукцион одного участника, предмет аукциона может быть продан данному участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10 (десять) рабочих дней** после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона:** предмет аукциона должен быть оплачен покупателем в течение **20 (двадцати) рабочих дней со дня проведения аукциона**

Победитель аукциона либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона, а также оплатить вознаграждение организатору аукциона, исчисляемое в процентном соотношении от цены продажи (4 % – по лотам № 1, 3; 3 % – по лоту № 2) в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения аукциона

Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 24.08.2021

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **29.09.2021 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»** |
| **Дата и время начала и окончания приема заявлений** | **С 09.00 16.09.2021 до 17.00 28.09.2021 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»** |

**Контактные телефоны: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06.**
**E-mail: auction@ipmconsult.by**

### ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Калинковичский завод железобетонных изделий» (продавец имущества) извещает о проведении 30 сентября 2021 года открытого повторного аукциона со снижением цены на 20 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| | **Адрес:** г. Калинковичи, ул. Подольская, 2 | | |
| 1 | Узлы и агрегаты автомобиля ИЖ 2717-30, 2004 г. в., объем двигателя 1,6, бензин, техпаспорт отсутствует | **1 280,00** | 256,00 |
| 2 | Узлы и агрегаты автомобиля VAZ 21043, 2005 г. в., объем двигателя 1,6, бензин, техпаспорт отсутствует | **720,00** | 144,00 |
| 3 | Узлы и агрегаты автомобиля ПАЗ 3205, 1998 г. в., объем двигателя 4,6, бензин | **1 920,00** | 384,00 |

**Продавец:** ОАО «Калинковичский завод железобетонных изделий», 247710, г. Калинковичи, ул. Подольская, 2.

**Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.:** 8 (29) 697-25-59 Свириденко Михаил Васильевич, 8 (029) 125-12-84, 8 (029) 332-43-49 Дулуб Сергей Сергеевич (осмотр техники), 8 (029) 739-52-98 Демедков Виктор Михайлович (заключение договора купли-продажи). **Шаг аукционных торгов – 5 %.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «Калинковичский завод железобетонных изделий»):** р/с BY06 BLBB 3012 0400 0554 2000 1003 в ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, УНП 400055420, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 16 сентября 2021 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00.

**Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 28 сентября 2021 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) %.** Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: произвести оплату услуг (вознаграждение) за организацию и проведение торгов, затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно срокам договора купли-продажи до **30 (тридцати) календарных дней** с момента подписания договора купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

**Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 16.07.2021 г. № 134 (29503).**

**Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232)23-23-54 (тел./факс), 23-23-56, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 126-66-62.**

### ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении повторных электронных торгов № 2021.Ч.002.00033 по продаже недвижимого имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by/.

**Продавец:** открытое акционерное общество «Витрембыт», тел. +375 212 48-70-26.

**Организатор, Оператор электронной торговой площадки ETPVIT.BY:** коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, +375 (29) 391-09-56, e-mail: vcm74@mail.ru, https://etpvit.by.

**Дата и время проведения повторных торгов**: 19.10.2021 г. в 09.00 (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

**Лот № 1**

- Изолированное помещение с инв. № 240/D-42005, расположенное по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. Орша, ул. Ивана Черняховского, 7А-1, площадью 327,1 кв. м, назначение – административное помещение, наименование – административное помещение.

Места общего пользования: котельная, коридор, тамбур, административное помещение с асфальто-бетонным покрытием, воротами металлическими, забором металлическим, водопроводной сетью, кабельной линией, канализационной сетью, наружной газовой сетью.

Описание составных частей: асфальтобетонное покрытие: материал – асфальто-бетон, площадь – 1388 кв. м; ворота металлические: ворота № 1 длина – 5,0 м, высота – 2,2 м, ворота № 2 длина – 4,1 м, высота 2,0 м; забор металлический протяженностью 60,0 м, материал – сетка рабица на металлических столбах, высота 1,5 м, площадь заполнения ограждения 90 кв. м; водопроводная сеть протяженностью 45,8 м; кабельные линии – кабель АСБ 3*35+1*16 протяженностью 14,1 м, длина 14,1 м, способ прокладки – подземный бесканальный; канализационная сеть общей протяженностью 67,5 м; наружная газовая сеть общей протяженностью 119,9 м.

- Капитальное строение с инвентарным номером 240/С-37346, расположенное по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. Орша, ул. Ивана Черняховского, 7А/1, площадью 233,3 кв. м, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – здание склада (далее – Имущество).

Имущество расположено на земельном участке с кадастровым номером 242400000004001353, расположенном по адресу: Витебская обл., г. Орша, ул. Ивана Черняховского, 7А, площадь – 0,4181 га, назначение – земельный участок под производственную базу. Земельный участок предоставлен на праве постоянного пользования, доля ОАО «Витрембыт» 93/100.

**Нач. цена:** 221 928,00 бел. руб. с учетом НДС. **Задаток:** 22 192,80 бел. руб.

Повторные электронные торги проводятся в соответствии с Регламентом ЭТП. **Для участия в электронных торгах** необходимо ознакомиться с Регламентом, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП. **Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами: до 16.00 18.10.2021. Сумма задатка перечисляется оператору электронных торгов на р/с:** № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566. Получатель – ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Условия повторных электронных торгов**: победитель торгов (единственный участник торгов, выразивший согласие на приобретение предмета торгов по начальной цене, увеличенной на пять процентов), обязан возместить затраты на организацию и проведение торгов в соответствии со сметой затрат, оплатить услугу по размещению одного аукциона и затраты на обслуживание ЭТП согласно прейскуранту, размещенному на сайте ЭТП; оплатить стоимость оценки приобретенного имущества в сумме 676,51 бел. руб. с НДС; заключить договор купли-продажи имущества в течение 14 рабочих дней со дня проведения электронных торгов, оплатить предмет эл. торгов в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи. **Обременения** в отношении изолированного помещения с инв. № 240/D-42005: бессрочный договор аренды № 08/18 от 08.06.2018 г., бессрочный договор аренды № 12/18 от 31.08.2018 г. С подробной информацией о предмете электронных торгов, порядке участия и оформления документов для участия в электронных торгах можно ознакомиться на сайте ЭТП ETPVIT.BY, по электронному адресу: https://etpvit.by, в разделе: недвижимое имущество. Ознакомиться с предметом торгов можно по предварительному согласованию с Продавцом по тел.: Костенко Сергей Александрович, +375298910059.

Утерянный бланк полиса формы 2РН, РП, серия КЕ, № 0124528, ЗАСО «КЕНТАВР», УНП 100985903, **считать недействительным**.

Утерянное свидетельство о государственной регистрации общества с ограниченной ответственностью «ГеоИнф» (УНП 193378686) **считать недействительным.**

Утерянное свидетельство о государственной регистрации общества с ограниченной ответственностью «2ГИС-БЕЛ» (УНП 193378737) **считать недействительным.**

### ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА по продаже не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, в том числе не завершенных строительством жилых домов, сроки консервации и завершения строительства которых истекли, с одновременной продажей права заключения договора аренды земельного участка

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел. (0212) 24-63-12.

**Лот № 1.** Не завершенный строительством законсервированный жилой дом с инв. № 230/U-16426, наименование – незавершенное законсервированное капитальное строение, назначение – здание неустановленного назначения (процент готовности 7 %: фундамент – бетонный, площадь застройки 119 кв. м) и право заключения договора аренды сроком на 50 лет земельного участка с кадастровым № 222750100001004809 площадью 0,1016 га для строительства и обслуживания жилого дома по адресу: Витебская обл., Лепельский р-н, г. Лепель, переулок Есенина, 40.

**Начальная цена предмета аукциона** (в т. ч. не завершенный строительством жилой дом/право заключения договора аренды зем. участка): **4365,43** (3452,30/913,13) бел. руб. **Задаток:** 436,00 бел. руб. Удельный вес стоимости не завершенного строительством жилого дома в начальной цене предмета аукциона – 79,08 %

**Дата, время и место проведения аукциона: 19.10.2021 г. в 12.00** по адресу: 211174, Витебская обл., Лепельский р-н, г. Лепель, ул. Ленинская, 6 в Лепельском районном исполнительном комитете». **Срок внесения задатка и приема документов: с 8.30 16.09.2021 г. до 15.00 18.10.2021 г. Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».**

**Задаток перечисляется на р/с:** BY68 AKBB 3604 3190 0102 5210 0000 ОАО «АСБ «Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 300039625, получатель платежа: Лепельский райисполком.

**Условия для победителя аукциона либо единственного участника**: в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся: внести плату за предмет аукциона и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением документации, необходимой для его проведения; не позднее двух рабочих дней после совершения победителем аукциона вышеуказанных условий, заключить договор аренды земельного участка с Лепельским районным исполнительным комитетом; в течение двух месяцев со дня подписания договора аренды земельного участка, но не позднее трех месяцев со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся в установленном порядке обратиться за гос. регистрацией права на зем. участок и уточнением его целевого назначения в Лепельский филиал РУП «Витебское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»; в течение одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство одноквартирного жилого дома приступить к занятию данного участка в соответствии с целью и условиями его предоставления (начать строительство); обратиться в Лепельский райисполком за выдачей разрешительной документации на строительство одноквартирного жилого дома; разработать проектно-сметную документацию на строительство одноквартирного жилого дома; завершить строительство одноквартирного жилого дома в сроки, определенные проектно-сметной документацией. **Назначение зем. участка** в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: 1 09 02 – размещение объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Инженерные коммуникации и сооружения на земельном участке отсутствуют. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией.

**Аукцион проводится в порядке, установленном Положением о порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 № 220. Для участия в аукционе приглашаются** граждане РБ, иностранные граждане, лица без гражданства (далее – граждане), индивидуальные предприниматели, юр. лица, консолидированные участники (двое и более граждан, индивидуальных предпринимателей, юр. лиц). Для участия в аукционе граждане, инд. предприниматели, консолидированные участники и юр. лица (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) в установленный в извещении срок подают заявление об участии в аукционе с указанием предмета аукциона, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, с отметкой банка, заключают соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются: гражданином – копия документа, удостоверяющего личность без нотариального засвидетельствования; инд. предпринимателем – копия свидетельства о гос. регистрации инд. предпринимателя без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина или инд. предпринимателя – доверенность, оформленная в соответствии с требованиями законодательства; представителем или уполномоченным должностным лицом юр. лица РБ – доверенность, выданная юр. лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих гос. регистрацию юр. лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юр. лица; представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юр. лица – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления об участии в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о фин. состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; Документы, составленные за пределами РБ в соответствии с законодательством иностр. государства, должны быть легализованы, если иное не предусмотрено законодательством. Консолидированными участниками представляются оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе. Аукцион состоится при наличии не менее 2 участников в отношении предмета аукциона. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением документации, необходимой для его проведения перечисляются на р/с, указанный в протоколе аукциона. Информация об окончательных суммах затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходах, связанных с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, письменно доводится до сведения участников перед началом проведения аукциона. Всем участникам предоставляется право ознакомления с документацией, а также возможность осмотра на местности предмета аукциона.

Конт. тел.: (0212) 24-63-12, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; **www.marketvit.by.**

# ПОЯС АДЗІНСТВА РЭГІЁНАЎ

## Выстаўка дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва «Пояс Адзінства» разгарнулася ў зале ўрачыстых цырымоній Палаца Незалежнасці

**Экспазіцыя прымеркавана да святкавання Дня народнага адзінства. Кожны рэгіён падрыхтаваў стэнд з работамі разнастайных відаў народнага мастацтва, характэрнымі для вобласці.**



Так, Магілёўшчына знакамітая сваёй керамікай. Мясцовыя майстры выпрацавалі ўласны ўнікальны стыль стварэння глінянага посуду і цацак. Брэсцкі рэгіён прадставіў традыцыйнае і сучаснае мастацтва краю. Даўніну ўвасабляюць экспанаты музейнага фонду, а сучаснасць — работы вышыўкі і ткацтва. Асноўная ідэя стэнда Гомельскай вобласці — «Рай на зямлі». Метафарычнае паняцце гамяльчане перадаюць праз унікальнасць мясцовых абрадаў і песень. Гродзенская вобласць зрабіла ў сваім стэндзе акцэнт на традыцыях ткацтва, выпечкі караваяў, стварэння выцінанак. Віцебшчына ў Палацы Незалежнасці экспануе «маляванкі» ў выглядзе размаляваных дываноў, аформленых у рамкі, і прэзентуе ўменне спіральнага пляцення выбараў з саломкі. Мінская вобласць дэманструе тэхналогію пляцення паясоў і вырабу драўнянага посуду. Аўтары тэматычнай зоны сталіцы зрабілі акцэнт на саломапляценні і выцінанках.

Адкрыў выстаўку **міністр культуры Анатоль МАРКЕВІЧ.** Па яго словах, свята народнага адзінства сімвалізуе сабой узаемаразуменне, узаемапавагу і добразычлівыя адносіны паміж людзьмі. Наша мова, літаратура, мастацтва, музыка з'яўляюцца культурным кодам нацыі, што вызначае беларусаў сярод усіх народаў свету. Анатоль Маркевіч растлумачыў, чаму выстаўка атрымала назву «Пояс Адзінства». «Пояс — гэта гістарычная рэч, якая заўсёды аберагала яе ўладальніка ад розных хвароб і напасцяў, з'яўляючыся самым распаўсюджаным элементам нацыянальнага касцюма ўсіх жыхароў Беларусі. Сёння, я ўпэўнены, што кожны з нас атрымае сапраўдную асалоду ад тых здабыткаў, што нам падарылі вялікія майстры. Мы будзем мець магчымасць дакрануцца да нашай вялікай спадчыны, вытокаў і каранёў», — сказаў міністр культуры.

**Старшыня Беларускага саюза мастакоў Глеб ОТЧЫК** адзначыў, што выстаўка ў Палацы Незалежнасці можа стаць яшчэ адным крокам да заснавання ў краіне музея дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. «Мастацтва яднае наш народ, розныя дзяржаўныя ўстановы, рознага кшталту мастакоў і нашы рэгіёны. Выстаўка вельмі яскравая. Я лічу, што гэта першы штуршок да з'яўлення ў нашай краіне музея дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Беларускі саюз мастакоў пра гэта марыць, дбае, і, я спадзяюся, мы вернемся да гэтага пытання», — падкрэсліў Глеб Отчык.



**Старшыня савета спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі, рэктар Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі Кацярына ДУЛАВА** заўважыла: на выстаўцы аб'яднаны традыцыі, што немагчыма пераацаніць: «Я сёння асабліва ганаруся, што наша выстаўка агучана спрадвечнай музыкай. Мы слухаем сёння спаконвечныя беларускія народныя інструменты, тую культуру, якая нарадзілася з нетраў народнай творчасці. Я маю на ўвазе прафесійную культуру. Нашы інструменты здольныя выконваць вельмі складаныя партытуры. Я ганаруся тым, што гэта робіць у тым ліку і наша выдатная творчая моладзь».





**Марыя ДАДАЛКА.**

# ДВУХМОЎНЫЯ СШЫТКІ І НЕПЕРААДОЛЬНАЯ МЯЖА

## Калекцыянер Уладзімір ЛІХАДЗЕДАЎ разам з гістарычным музеем падрыхтаваў выстаўку да Дня народнага адзінства

**У Дзень народнага адзінства амаль усе дзяржаўныя ўстановы плануюць правядзенне розных мерапрымстваў, прымеркаваных да свята. Вось і Нацыянальны гістарычны музей зладзіў тэматычную выстаўку. Мы пабывалі там, калі экспазіцыю яшчэ толькі рыхтавалі для наведвальнікаў: расстаўлялі экспанаты, падключалі ТВ-экраны і развешвалі банеры з гістарычнымі сведкамі. Аб задумцы выстаўкі «Звяздзе» расказаў дырэктар Нацыянальнага гістарычнага музея Аляксандр ХРАМОЙ:**

— Да Дня народнага адзінства наш музей падрыхтаваў выставачны праект, звязаны з падзеямі аб'яднання Заходняй Беларусі з БССР. У 1921 годзе наш народ па-жывому падзялілі мяжой, перасекчы якую было амаль немагчыма. Наша выстаўка паказвае шлях беларускага народа да аб'яднання. Гэта матэрыялы прэсы Заходняй Беларусі і БССР. Падзеі, звязаныя з паходам Чырвонай арміі. А таксама адлюстраванне лёсаў людзей, якія ў той час жылі на тэрыторыі Беларусі, расповед аб іх міжканфесійным і міжнацыянальным адзінстве. Мы раскажам аб перашкодах, якія давялося пераажыць беларускаму народу на шляху да адзінай нацыі, адзінай тэрыторыі. Таксама можна будзе даведацца аб дзеячах, якія імкнуліся да аб'яднання, напрыклад, аб старшыні Савета народных камісараў Аляксандры Чарвякове.

Падчас стварэння гэтай выстаўкі разам з Нацыянальным гістарычным музеем працаваў гісторык і калекцыянер Уладзімір Ліхадзедаў. Шмат рэчаў, якія складаюць экспазіцыю, знайшоў менавіта ён:



— Вядома, будуць прадстаўлены таксама экспанаты фондаў Нацыянальнага гістарычнага музея і Нацыянальнага гістарычнага архіва. З таго, што дадаў уласна я, назаву найперш друкарскі станок, на якім друкаваліся лістоўкі. Будзе прадстаўлена і беларуская прэса 1921—1939 гадоў, якая выдавалася на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Там адлюстравана жыццё беларусаў таго часу, іх праблемы, звязаныя з мовай, прызнаннем нацыянальнасці, закрыццём школ. Даволі цікавая, праўдзівая інфармацыя, якую, акрамя як з гэтых газет, больш нідзе не возьмеш. Таксама з маёй калекцыі на выстаўцы дэманструюцца пісьмовыя прылады, якімі карысталіся жыхары як Заходняй, так і Усходняй Беларусі. І ўнікальная экспазіцыя, прысвечаная тагачаснай школе: тут і сшыткі, і алоўкі, і чарніліцы. У Польшчы існавалі беларускамоўныя гімназіі, але іх было мала. Гэтых школ не хапала. Па сшытках прасочваецца палітычная сітуацыя ў краіне: пачынаецца вучэбны год 1939-га — вучань піша па-польску. Той жа самы сшытак у кастрычніку-лістападзе — і там ужо запісы на іншай мове.



***— Вы анансавалі, што на выстаўцы можна будзе пазнаёміцца з беларускай прэсай тых гадоў. Раскажыце, калі ласка, у чым яе адметнасць?***

— Пісалі аб праблемах, звязаных з адукацыяй. Аб прыгнёце беларусаў, апалячванні: падчас перапісу насельніцтва ў графе «нацыянальнасць» пазначалі людзей як палякаў, хоць яны былі беларусамі.

***— А што наконт цэнзуры? Бо тое, што вы згадалі, даволі вострыя тэмы. Відавочна, што яны не падабаліся ўладам.***

— Можна сказаць, што беларуская прэса не падвяргалася цэнзуры, бо час яе існавання быў зусім кароткі. Яе проста закрывалі. Год-два, мабыць менш, і выдання няма. У некаторых выданнях увогуле паспявалі выйсці адзін-два нумары. Польскім уладам праўда, што гучала ў беларускай прэсе, не падабалася. Большая частка тых газет выходзіла на беларускай мове, менавіта кірыліцай. Самае галоўнае, што ў розных заходнебеларускіх партый, нягледзячы на разыходжанні ў палітычных поглядах, меркаванне наконт беларускага пытання было адзіным — аб'яднанне.

Уладзімір Ліхадзедаў расказаў, што сваю калекцыю ён збіраў больш за 47 гадоў і што такой калекцыі, прысвечанай Беларусі, больш ні ў кога ў свеце няма. Каб пазнаёміцца з выстаўкай «17 верасня — Дзень народнага адзінства» падрабязней, запрашаем вас наведаць Нацыянальны гістарычны музей.

**Арына КАРПОВІЧ. Фота аўтара.**

### Сядзі і глядзі

# Святочны эфір на «Беларусь 3»

**Заўтра, 17 верасня, наша краіна святкуе Дзень народнага адзінства. І гэтай падзеі прысвечаны тэматычны эфір сацыякультурнага тэлеканала. Увазе гледачоў прадставяць кінастужкі, у тым ліку і дакументальныя, а таксама канцэрт заслужанага артыста Беларусі Руслана Аляхно «За жыццё».**

У дзённым эфіры пабачым дакументальны фільм «Перазвон» (2021) Яўгена Сяцько. Гэты аповед-прысвячэнне расказвае пра тысячы спаленых вёсак у часы Вялікай Айчыннай вайны і дае магчымасць гледачам пераасэнсаваць тыя падзеі ў сучасным свеце. У вячэрнім эфіры пакажуць таксама дакументальны фільм згаданага рэжысёра «Мяжа», які ўбачыў свет да 80-годдзя аб'яднання Усходняй і Заходняй Беларусі. У кінатворы — жывыя сведкі тых падзей і аб'ектыўныя разважанні гісторыкаў, а высновы ўжо кожны зробіць сам.

Можна будзе перагледзець і мастацкую кінастужку «Дняпроўскі рубеж» (2009) Дзяніса Скварцова. Нагадаем, фільм распавядае аб тым, як у пачатку Вялікай Айчыннай вайны, калі войска нямецка-фашысцкіх захопнікаў імкліва прасоўвалася па тэрыторыі Савецкага Саюза, горад Магілёў, Дняпро, Буйніцкае поле надоўга затрымалі націск ворага. Асновай для фільма сталі абарона Магілёва ў жніўні 1941 года і так званы Дняпроўскі рубеж — рэальная гістарычная падзея.

А потым тэлеаўдыторыю чакае канцэрт Руслана Аляхно «За жыццё». І ўжо ў вячэрнім эфіры на «Беларусь 3» пакажуць дакументальны фільм «Мяжа» (выйшаў на «Беларусьфільме» ў 2019) і мастацкую кінастужку «Вадзіцель аўтобуса» (1983).

**Алена ДРАПКО.**

### Запрашальнік

# Жыццё па той бок мяжы ў рэтраспектыве гісторыі

**У Дзень народнага адзінства, 17 верасня, у палацавым ансамблі і Ратушы Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Нясвіж» адбудуцца тэматычныя мерапрыемствы, прымеркаваныя да святочнага дня.**



Як расказалі ў адміністрацыі музея-запаведніка, распачне свята канцэртная праграма аматарскіх калектываў Нясвіжскага раёна «Мы разам!», якая пачнецца ў 15.00 у Тэатральнай зале палацавага ансамбля.

Праз гадзіну ў гарадской Ратушы запланавана прэзентацыя абноўленай часткі экспазіцыі, прысвечанай паўсядзённаму жыццю людзей у міжваенныя дзесяцігоддзі, — «Нясвіж у міжваенны час. Людзі і падзеі». Адна з залаў пастаяннай экспазіцыі Ратушы з дапамогай музейных прадметаў раскажа наведвальнікам аб жыцці людзей у 1920—30-я гады XX стагоддзя. У прыватнасці, як было па тую частку мяжы.

Нагадаем, што пасля падпісання Рыжскага дагавора ў 1921 годзе тэрыторыя Беларусі была падзелена на дзве часткі — заходнюю і ўсходнюю. Мяжа праходзіла па сучаснай Мінскай вобласці. Тагачасны Нясвіж разам з іншымі заходнімі гарадамі і сёламі ўвайшоў у склад Польшчы.

На прыкладзе тэмы «Нясвіж у міжваенны час. Людзі і падзеі» аўтары экспазіцыі паспрабавалі паказаць асаблівасці тагачаснага жыцця Нясвіжскага павета.

«Трэба сказаць, што галоўным лейтматывам экспазіцыі праходзіць тэма ўз'яднання тэрыторыі заходняй і ўсходняй частак Беларусі, кансалідацыі беларускай нацыі пасля прымусовага і гвалтоўнага «рыжскага падзелу», — патлумачыў сутнасць экспазіцыі **дырэктар Нацыянальнага музея-запаведніка «Нясвіж» Дзмітрый ЯШЧАНКА** і запрасіў усіх ахвотных наведаць выстаўку, каб на ўласныя вочы пабачыць гістарычныя сведчанні ўмоў тагачаснага жыцця і перакапацца ў палітычных хібах, што адбіліся на лёсах соцень тысяч беларусаў.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

## Даты Падзеі Людзі

### 16 ВЕРАСНЯ

**У краіне**

**1906** год — нарадзіўся (г. Буда-Кашалёва) Валянцін Пятровіч Дрозд, савецкі военачальнік, віцэ-адмірал. Служыў на караблях Балтыйскага флоту. Удзельнік грамадзянскай вайны ў Іспаніі, савецка-фінскай вайны 1939—1940 гадоў. З 1941-га камандаваў эскадрай караблёў Балтыйскага флоту, удзельнік абароны Ленінграда. Атрад караблёў пад яго камандаваннем здзейсніў пераход з Таліна ў Кранштат, ажыццявіў эвакуацыю абаронцаў паўвострава Ханка. Загінуў у 1943 годзе на лядовай трасе пад Кранштатам. Яго імем названы эсмінец на Балтыйскім флоце і вялікі супрацьлодкавы карабель Паўночнага флоту.



**1931** год — нарадзіўся (в. Зарачаны Полацкага раёна) Пётр Фёдаравіч Лысенка, беларускі археолаг, доктар гістарычных навук, прафесар. Працаваў у Інстытуце гісторыі НАН Беларусі. Даследаваў курганы XI—XII стст., старажытныя гарады Тураў, Брэст, Пінск, Слуцк, Мазыр і інш. Вынікам шматгадовых даследаванняў у Брэсце і Тураве стала стварэнне археалагічных музеяў «Бярэсце» і «Старажытны Тураў». Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі.

**1937** год — нарадзіўся Барыс Іванавіч Луцэнка, рэжысёр, педагог, заслужаны дзеяч мастацтваў, народны артыст Беларусі. Быў рэжысёрам, галоўным рэжысёрам, рыжысёрам-пастаноўшчыкам Беларускага тэатра імя Я. Купалы і Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М. Горкага. Сярод найлепшых пастановак: «Зацюканы апостал» і «Таблетку пад язык» А. Макаёнка, «Вяртанне ў Хатынь» А. Адамовіча і многія іншыя.

**У свеце**

**1857** год — Джэйн Пірпонт з Бостана атрымала аўтарскія правы на песню «One Horse Open Sleigh», больш вядомую як «Jingle Bells». Гэтая калядная песенька была напісана для прадстаўлення ў нядзельнай школе, і цяпер без яе не абыходзіцца ніводнае калядное свята.

**1914** год — расійскай Дзяржаўнай Думай быў прыняты закон аб забароне продажу гарэлкі на час вайны.

**1918** год — заснаваны ордэн Чырвонага Сцяга. Першы савецкі ордэн. Быў заснаваны для ўзнагароджання за асаблівую адвагу, самаадданасць і мужнасць, праяўленыя пры абароне сацыялістычнай Айчыны. Ордэнам Чырвонага Сцяга таксама ўзнагароджваліся вайсковыя часці, ваенныя караблі, дзяржаўныя і грамадскія арганізацыі. Аж да заснавання ордэна Леніна ў 1930 годзе ордэн Чырвонага Сцяга заставаўся вышэйшым ордэнам Савецкага Саюза.

**Так гаварыла...**

**СІМОНА ДЭ БАВУАР:**

*«Жадаць свабоды сабе — значыць жадаць свабоды іншым».*

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Заход | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | — 6.44 | 19.23 | 12.39 |
| Віцебск | — 6.33 | 19.14 | 12.41 |
| Магілёў | — 6.34 | 19.13 | 12.39 |
| Гомель | — 6.32 | 19.09 | 12.37 |
| Гродна | — 7.00 | 19.38 | 12.38 |
| Брэст | — 7.02 | 19.38 | 12.36 |

### Месяц

***Першая квадра 13 верасня. Месяц у сузор'і Вадаліва.***

### Імяніны

***Пр.** Домны, Аляксея, Захара, Івана, Пятра, Яфіма.*
***К.** Камілії, Людмілы, Эдзіты, Карнеля, Цыпрыяна.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




### УСМІХНЕМСЯ

Чаму халадзільнікі квадратныя, а каструлі і талеркі круглыя? І ў выніку ў цябе нічога нармальна не залазіць у халадзільнік пры тым, што паміж талеркамі застаецца безліч пустога бескарыснага месца.



ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
для зваротаў: zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 2352.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 15 верасня 2021 года.